таму параўнанне першых публікацый твораў і пазнейшых, дапрацаваных і ўдасканаленых, дае магчымасць прасачыць адметнасці адбору моўна-выяўленчых сродкаў і вызначыць, якія з асаблівасцяў мовы Купалавых твораў сталі нарматыўнымі, а якія на сённяшні дзень нормай літаратурнай мовы не з'яўляюцца.

1. Купала, Янка / Янка Купала. Поўны збор твораў. У 9 т. Т.8. Артыкулы, нататкі, выступленні. Калектыўныя творы. - Мінск: Мастацкая літаратура, 2002. - 462 с.
2. Усціновіч, Г.К. «Наша ніва» /Беларуская мова: Энцыклапедыя. -Мінск: «Беларуская энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1994. - С.384-386.
3. Бобрык, У.А. Індывідуальныя купалаўскія словаўтварэнні //Беларуская мова. Вып. 9. - Мінск: Выд-ва БДУ імя У.І. Леніна,1981 -С.38-47.

*УДК 811.161.3*

## ІГНАТ ДАМЕЙКА – ВУЧОНЫ, ЛІТАРАТАР, МАСТАК

*В.У. Тарас – студэнт 1 курса БДАТУ*
*Навуковы кіраўнік – ст. выкладчык А.Б.Гурновіч*

У развіцці сусветнай навукі, літаратуры, мастацтва ўнеслі значны ўклад беларусы, выхадцы з нашай зямлі. Многія імёны шырокавядомыя ў свеце, але, на жаль, яшчэ малавядомыя на сваёй радзіме. Адзін з такіх людзей – Ігнат Дамейка, нацыянальны герой Чылі.

Нарадзіўся Ігнат Дамейка 31 ліпеня 1802 года ў радавой сядзібе Мядзведка (сёння Карэліцкі раён Гродзенскай вобласці). Страціўшы ў сем гадоў бацьку, дзяцінства Ігнат правёў у маёнтку Жыбуртоўшчына Лідскага павета. Яму было чатырнаццаць гадоў, калі ён скончыў Шчучынскую школу і стаў студэнтам фізіка-матэматычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта, дзе пачаў старанна вывучаць выбраныя ім навукі: біялогію, хімію, матэматыку, адначасова наведваючы лекцыі прафесараў па літаратуры і гісторыі.

Пасля заканчэння ўніверсітэта Дамейка атрымаў ступень магістра матэматыкі, але юнак не спяшаўся развітвацца з універсітэтам. Яму хацелася глыбей вывучыць гісторыю, літаратуру, мову. Акрамя беларускай, польскай і рускай моў, ён ужо добра ведаў англійскую і французскую, вывучаў нямецкую і латынь. Цікавілі яго і гісторыя, архітэктура, геадэзія. Акрамя таго, затрымлівалі маладога чалавека ва ўніверсітэце, у Вільні, і абавязкі ў Таварыстве філаматаў.

Таварыствы філаматаў і філарэтаў, якія існавалі ў 1817-1823 гг. ў асяроддзі студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, выхавалі пляяду такіх людзей, як Адам Міцкевіч, Тамаш Зан, Ян Чачот і многіх іншых, сярод якіх быў і Ігнат Дамейка. Задачамі гэтых таварыстваў была асвета сваіх землякоў, самаўдасканаленне, стварэнне падручнікаў для народнай адукацыі, галіновых

энцыклапедый, арганізацыя народных школ, усебаковае вывучэнне зямел існаваўшага яшчэ зусім нядаўна Вялікага княства Літоўскага.

Але наступіў трагічны 1823 год. Пачынаецца следства па справ філарэтаў і філаматаў. У лістападзе 1823 года Дамейку арыштоўваюць адпраўляюць у турму.

Каля паўгода прыйшлося таміцца маладому патрыёту ў халодных ту рэмных сценах, і толькі вясной наступнага года ён апынуўся на волі. Дзя куючы дапамозе ўплывовых сваякоў, яму ўдалося пазбегнуць высылкі аддаленыя губерні Расіі. Улады пакуль задаволіліся толькі адпраўка "змоўшчыка" у родную вёску пад нагляд паліцыі.

Там правёў Ігнат Дамейка шэсць гадоў. Затым прымаў удзел паўстанні 1830-1831 гадоў.

Пасля паўстання Дамейка апынуўся ў Парыжы, дзе заняўс падрыхтоўкай да друку, выданнем прац і мастацкіх твораў сваіх сябро Асабліва адчувальную падтрымку атрымліваў Адам Міцкевіч. Калі па пачаў пісаць свой самы вялікі і значны твор "Пан Тадэвуш", Дамейка я знаўца роднай Наваградчыны быў у гэтай тытанічнай працы незаменны памочнікам і кансультантам. Гэта яго, Дамейку, меў на ўвазе Міцкеві калі у адным з лістоў распавядаў, як пісалася паэма: "І сябры дапамага сваімі апавяданнямі і для песні мне кідалі слова за словам ".

Менавіта Ігнату Дамейку даручыў паэт і перапісванне паэмы для дру ку. Гэта была немалая праца - перапісаць начыста велізарны па сваіх па мерах твор.

Дамейка быў не толькі ў некаторай ступені сааўтарам у напісанні па эмы, але і асобнымі рысамі свайго характару з'яўляўся правобразам аднаг з галоўных герояў твора – Яцэка Сапліцы. Паэт нават збіраўся назваць яг імем усю паэму, паставіўшы ў цэнтр увагі вобраз нашага героя прадстаўніка дробнай беларускай шляхты, носьбіта свабодалюбівых ідэй.

У Парыжы Дамейка слухае лекцыі знакамітых навукоўцаў, наведваючы такія сур'ёзныя цэнтры навукі, як Коледж дэ Франс і Сарбона. Каб удасканаліц свае веды ў абранай ім мінералогіі, Дамейка паступае ў Горную школу. За тры гады ён прайшоў увесь курс навучання, скончыўшы школу ў 1837 годзе вялікім багажом ведаў і дыпломам спецыяліста ў руках.

Некаторы час ён паспяхова працуе ў Эльзасе, затым з дапамогай Адам Міцкевіча атрымлівае прапанову , якая стала паваротнай у яго жыцці. Гэт было месца прафесара хіміі і металургіі ў Чылі.

"Я ажыў, - пісаў Дамейка потым у сваіх запісках. – Ажылі і ма дзіцячыя мары аб далёкіх падарожжах".

І вось у 1838 годзе Дамейка ў Чылі. Свае ўражанні аб далёкай краіне ё апісаў так: "Напэўна, няма краю, які быў бы так непадобны на наш, як гэть Толькі скалы, пустыні і мора. Ні лясоў, ні шырокіх палёў, ні такіх, як у на лугоў, ні вёсак. Увесь гарызонт засланы з усходу Кардыльерамі, вострым грабянямі гор. На захадзе ж шырока раскінулася бясконцае мора".

Задача вучонага - мінералагаведа, горнага інжынера Ігната Дамейкі ў Чылі была ў тым, каб падрыхтаваць спецыялістаў па вывучэнні і выкарыстанні прыродных багаццяў гэтай краіны, стварыць тут адпаведную навуковую базу. Дзяржава, якая нядаўна вызвалілася ад іспанскай каланіяльнай залежнасці, мела вострую патрэбу ў такіх людзях. Сваю задачу Дамейка выканаў належным чынам. Ён стварыў школу па падрыхтоўцы спецыялістаў, арганізаваў лабараторыю.

Паралельна Дамейка арганізоўвае экспедыцыі па ўсебаковым вывучэнні Чылі. У сталіцы краіны, Сант'яга, яму прапанавалі пасаду прафесара хіміі і мінералогіі ў нядаўна адкрытым тут універсітэце. Праз некаторы час ён ужо ўзначальваў кафедру хіміі, стаў сябрам універсітэцкага савета. Вучоны зноў пагружаны ў педагагічную і навуковую працу.

Тым часам у планы прафесара ўмяшалася каханне. Яго зачаравала чароўная спадарыня Энрыветта дэ Сатамаер. І 48-гадовы навуковец у 1850 годзе ажаніўся з маладой чылійкай. Выхаванец Мядзведкі, віленскі філамат і гаспадар Заполля, зараз з каранямі пачаў урастаць у амерыканскую зямлю.

Адзін за адным пайшлі ў сям'і дзеці, але Дамейка не пакідае надзеі вярнуцца на радзіму. Вось словы з ліста да Адама Міцкевіча: "Калі б была магчымасць вярнуцца і паслужыць яшчэ, хоць на старасці гадоў, свайму краю, не ўседзеў бы тут, хоць я даўно ўжо стаў грамадзянінам гэтай краіны, уладальнікам маёнтка і бацькам".

Чорным для Ігната Дамейкі і сям'і стаў снежань 1870 года: нечакана памёрла жонка. На руках у яго засталося трое дзяцей: пятнаццацігадовая дачка Аніта і двое малодшых сыноў - Гернон і Казімір.

За час, праведзены ў Чылі, краіне, якая многім была яму абавязаная, ён стаў вельмі паважаным чалавекам. Беларускі выгнаннік, які ад прафесара і кіраўніка кафедры даслужыўся да рэктара Чылійскага ўніверсітэта, рэарганізаваў усю сістэму навучання ў гэтай паўднёваамерыканскай краіне, у тым ліку і ў самім універсітэце. За узор ім была ўзята сістэма адукацыі ў Беларусі, сістэма, якую праводзіў у жыццё Віленскі ўніверсітэт. Рэформы дазволілі прыцягнуць да навукі лепшыя інтэлектуальныя сілы Чылі, пашырыць адукацыю ў краіне. Ігнат Дамейка сам пісаў падручнікі для школ па натуральных навуках. Ён стварыў у Чылі музей мінералагічных і палеанталагічных матэрыялаў, заснаваў фізічны кабінет, хімічную і горную лабараторыі, арганізаваў бібліятэку прыродазнаўства. Велізарныя заслугі Ігната Дамейкі і як навукоўца - даследчыка чылійскіх прыродных багаццяў. Ён адкрыў тут багатыя радовішчы золата, срэбра, медзі, каменнага вугалю, салетры, арганізаваў іх здабычу. Вучоны сабраў і апісаў мноства новых, невядомых навуцы мінералаў, раслін, закамянеласцяў, метэарытаў. А яшчэ ён знайшоў у гарах крыніцы чыстай вады, правёў адтуль у Сант'яга вадаправод, цалкам вырашыўшы праблему водазабеспячэння чылійскай сталіцы. У адным з афіцыйных чылійскіх друкаваных выданняў адзначалася: « ... ніхто не зрабіў так шмат для прагрэсу і развіцця навук у Чылі, як спадар Дамейка».

Толькі ў 1884 годзе, вызваліўшыся, нарэшце, ад напружанай працы, змог 82-гадовы выгнаннік ажыццявіць сваю неадступную мару - пабачыць родную зямлю.

Праводзілі яго ўрачыста, з пашанаю, якая аказвалася толькі самым высокім асобам дзяржавы.

На радзіме Дамейка прабыў чатыры гады, пажыў у памятнай з дзяцінства Жыбуртоўшчыне. Пабываў у Італіі, Турцыі, Палесціне, Егіпце. За час яго знаходжання ў Беларусі сыны Дамейкі атрымалі еўрапейскую адукацыю і гарэлі жаданнем працаваць на радзіме сваёй маці.

Разам з сынамі вяртаўся на сваю другую радзіму і састарэлы прафесар. Але нядоўга заставалася пажыць яму пасля вяртання ў Сант'яга. 23 студзеня 1889 г яго не стала. Дзень яго смерці быў абвешчаны ў Чылі днём нацыянальнай жалобы. А ў сваей прамове на жалобным мітынгу прэзідэнт краіны Бальмакеда абвясціў аб прысваенні Дамейку звання нацыянальнага героя Чылі.

Памяць пра Ігната Дамейку свята шануецца ў далёкай паўднёваамерыканскай краіне. Яго імя носяць і велічны тысячакіламетро-вы горны хрыбет, які пазначаны на картах як Кардыльеры Дамейкі, і прыгожы светлы горад Дамейка ў зялёнай даліне, і порт на самым беразе Ціхага акіяна - Пуэрта дэ Дамейка. Усе гэтыя геаграфічныя мясціны названы ў гонар таленавітага і працавітага сына беларускай зямлі. А ў сталіцы Чылі ўзвышаецца велічны помнік з выявай знакамітага беларуса і высечаным на граніце лаканічным надпісам на іспанскай мове - Грандэ Эдукадор, што азначае - Вялікі Асветнік.

Імя Ігната Дамейкі ўвекавечыў і навуковы свет. Яго імем назвалі адкрыты навукоўцам у чылійскіх гарах мінерал "Дамейка", аманіт "амонітэс домейканус", выкапнёвы малюск "наўтылус дамейкус", а таксама знойдзены і апісаны Дамейкам від фіялкі - "віёла дамейкана".

Вялікі вучоны-прыродазнавец не менш цікавы і як літаратар і мастак. Дарэчы, менавіта замалёўкі Дамейкі ўпрыгожваюць многія кнігі Адама Міцкевіча і пра Адама Міцкевіча. Майстэрства ж літаратара асабліва ярка выявілася ў дарожных запісках Дамейкі, вядомых, пад агульнай назвай "Мае падарожжы". Аўтар вельмі цікава, вобразна распавядае пра свае сустрэчы з рознымі краінамі, з людзьмі, лаканічнымі, але дакладнымі штрыхамі малюе ўбачаныя пейзажы, унутраны свет герояў, распавядае пра культуру і побыт жыхароў, паглыбляецца ў гісторыю земляў. Падарожнічаючы па далёкіх краінах, беларускі выгнаннік ні на хвіліну не забывае пра тое, адкуль ён родам. Апісваючы пейзажы чужых, нярэдка экзатычных зямель, аўтар вельмі часта параўноўвае іх з роднымі мясцінамі, пра якія ўвесь час думае і сумуе. Пры гэтым у памяці, натуральна, усплываюць і назвы гэтых месцаў, а за імі і жывыя беларускія словы, якіх няма-ла можна сустрэць у польскамоўных творах аўтара.

Кнігі Ігната Дамейкі - дарожныя запіскі, успаміны, навуковыя працы атрымалі ў свой час шырокі водгук у свеце. У перакладах на шматлікія мовы яны яшчэ ў XIX стагоддзі абышлі ўвесь зямны шар.

Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе яны будуць вядомы і на Беларусі.